***Смолік А.І., Вярбіцкая В.І.*** *(Мінск)*

## АСЭНСАВАННЕ КУЛЬТУРЫ ЧЫТАННЯ ЯКУБАМ КОЛАСАМ: КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Культуралогія як навука аб культуры ў першым дзесяцігоддзі XXI ст. дасягнула сталага ўзроўню развіцця і ўжо набыла пэўную сістэмнасць, якая дазваляе прэтэндаваць на асэнсаванне шэрагу праблем, што ў сумежных навуках да гэтага часу не атрымалі глыбокага асвятлення. Дастаткова сказаць, што культуралагічная рэфлексія ў заходнееўрапейскіх краінах і Расіі ўжо трывала прапісалася ў гісторыі, мастацтве, літаратуры, псіхалогіі і педагогіцы. Шэраг прац М.А. Арыярскага, Р. Барта, М.М. Бахціна, А.С. Запясоцкага, В.В. Іванова, Ю. Крысцевай, Д.С. Ліхачова, Я.М. Мелецінскага, У.Я. Пропа, У.М. Тапарова і іншых навукоўцаў тычацца метадалогіі культуралагічных ведаў у галіне розных сацыягуманітарных навук. Так, М.М. Бахцін пры аналізе творчасці Ф. Рабле і Ф.М. Дастаеўскага адкрыў цэлыя пласты культуры, якія сягаюць у старажытнасць, але сугучны ідэям сучаснасці. Ён у працы «Эстетнка словесного творчества» падкрэсліваў, што «лптература - неотрывная часть культуры, ее нельзя понять вне целостного контекста всей культуры данной эпохи» [1]. З гэтага выказвання М.М. Бахціна вынікае больш глыбокае і праблемнае меркаванне аб тым, што літаратура не замыкаецца ў сваім гістарычным часе, а сэнс літаратурнага твора выходзіць за межы сваёй эпохі. Вялікія творы літаратуры, па меркаванні Ю. Крысцевай, падрыхтоўваюцца стагоддзямі, а ў эпоху іх стварэння здымаюцца толькі спелыя плады працяглага і складанага працэсу выспявання [2]. Згодна з палажэннямі канататыўнай семіялогіі літаратурны тэкст, створаны з мноства раўнапраўных кодаў, у сваю чаргу сам аказваецца ўплецены ў бясконцую тканіну культуры, з'яўляецца яе памяццю, пры тым не толькі памятае культуру мінулага і сучаснасць, але бачыць і культуру будучага.

Дыяхранічны падыход Ю. Крысцевай да ацэнкі літаратурнага твора, безумоўна, цалкам магчыма выкарыстаць пры культуралагічным аналізе творчасці класікаў беларускай літаратуры, сярод якіх вылучаецца магутная постаць Якуба Коласа. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка, адзначаючы ролю літаратуры ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці, зазначыў, што ў незалежнасць і свабоду беларускага народа ўкладзена «сила слова светочей национальной культуры: Якуба Колоса, Янки Купалы, Максима Богдановича и многих-многих других» [3]. Тэкставы аналіз коласаўскіх літаратурных твораў сведчыць, што яны напоўнены сэнсавымі аб'ектамі, якія перасякаюць разнастайныя дыскурсы, рухаюцца праз іх. Коласаўскае слова як бы размеркавана паміж рознымі дыскурсіўнымі інстанцыямі, якія мноства «я» здольны запоўніць адначасова. Літаратурныя творы Коласа ўключаны ў цэлую сістэму культурных каардынат, яны як бы сатканы з мноства ведаў. Коласаўскаму тэксту ўласцівы шматлікія тэарэтычныя тэмы - філасофскія, палітычныя, лінгвістычныя, рэлігійныя, сацыялагічныя, педагагічныя і інш. На наш погляд, значнае месца ў коласаўскай дыскурсіўнай практыцы займае педагагічны дыскурс, у прыватнасці распрацоўка праблем тэорыі сацыялізацыі і інкультурацыі асобы. Без перабольшвання можна сцвярджаць, што Я. Колас развіў шэраг важнейшых палажэнняў гэтай тэорыі. Найбольш грунтоўна погляды на працэс фарміравання асобы ён абгрунтаваў у сваёй дыдактычнай працы «Методыка роднай мовы», работу над якой творца завяршыў у 1925 г. [4]. Па меркаванні пісьменніка, значнае месца ў фарміраванні асобы адыгрывае кніга. Чытанне, лічыў народны паэт Беларусі, служыць эстэтычнаму выхаванню суб'ектаў культуры, «яно ўзбагачае іх фантазію новымі вобразамі, даючы разнастайныя перажыванні, выхоўвае ў іх густ да прыгожага, да паэзіі і мастацтва» [5]. Высока ацэньваючы ролю кнігі і чытання, Я. Колас прысвячае псіхалогіі чытання асобны раздзел у «Методыцы роднай мовы». Думкі, выказаныя Я. Коласам, на наш погляд, не толькі не страцілі свайго значэння, але значна актуалізаваліся ў наш час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема чытацкай дзейнасці ў XXI ст. набыла асаблівую вастрыню, якая абумоўлена бурным развіццём віртуальнай прасторы сеткі Інтэрнэт як глабальнай сацыяльна-камунікатыўнай сістэмы, дзе назіраецца велізарны выбух камунікатыўнай дзейнасці. Культура, што складваецца ў сетцы Інтэрнэт, усё мацней набывае візуальны характар і патрабуе ўліку пры арганізацыі чытацкай дзейнасці. Удзельнікі Сусветнага бібліятэчнага форуму ў Давосе, які адбыўся ў 2009 г., з вялікай занепакоенасцю гаварылі аб наступленні сістэмнага крызісу чытацкай культуры. Шэраг краін свету падышлі да крытычнай мяжы абыякавых адносін да чытання і пераступілі небяспечны бар'ер у 50%, калі пачынаецца беспаваротны працэс пераўтварэння з краіны з вельмі высокім ўзроўнем чытання ў краіну «трэцяга свету» паводле гэтага крытэрыю. Сёння ў Расіі, напрыклад, 65% яе жыхароў не чытаюць кнігі [6]. Расійская даследчыца псіхалогіі чытання В.А. Барадзіна адзначае, што ва ўмовах экспансіі відэа і камп'ютарнай культуры, з аднаго боку, застаецца менш часу на чытанне, з другога - пастаянна павялічваецца колькасць друкаванай прадукцыі [7]. Такім чынам, чытанне як форма дзейнасці не знікае, а трансфармуецца ў новы від пад уплывам інавацыйнага спосабу візуальнага ўспрымання. Вось чаму погляды Я. Коласа на сутнасць чытання, яго ролю і месца ў сацыялізацыі і інкультурацыі асобы, на наш погляд, надзвычай запатрабаваны і ў нашым стагоддзі. Чытанне, на думку творцы, з'яўляецца «адзіным сродкам самаасветы», тым спосабам, якім вучні могуць «папаўняць свае веды незалежна ад дапамогі настаўніка», «разбірацца у тым матэрыяле, што дае кніга» [8]. Аўтар дыдактычнай працы, якая аналізуецца, быў перакананы, што чытанне адметна тымі асабістымі перажываннямі асобы, якія ўзнікаюць пры чытанні твора, тымі вобразамі, што «падымаюць, узвышаюць і крышталізуюць дух дзіцяці» [9].

Беларускі творца разглядаў чытанне мастацкіх твораў як важнейшы элемент выхавання ў шырокім сэнсе слова. На падставе гэтага пісьменнік распрацаваў методыку чытання і прапанаваў беларускім педагогам шэраг дыдактычных спосабаў, з дапамогай якіх магчыма выпрацаваць у школьнікаў навыкі і ўменні, неабходныя для чытання. Значную ўвагу Я. Колас надаваў аналізу псіхафізічных працэсаў, якія выклікаюцца чытаннем. Псіхалогія чытання ім аналізуецца адпаведна асноўным палажэнням тагачасных канцэпцый, распрацаваных еўрапейскімі навукоўцамі Дж. Локам, В. Ікельзамерам, Г.А. Салісам, Ж. Жакато, К. Шмітам і інш. Пры вызначэнні псіхалагічных асноў розных відаў чытання пісьменнік выкарыстоўвае багатую педагагічную спадчыну рускіх вучоных П.А. Афанасьева, К.Д. Ушынскага, А.А. Фартунатава, Л.І. Цімафеева і інш. Псіхалогію чытання Я. Колас разглядаў у шырокім і вузкім значэннях дадзенага паняцця. У вузкім разуменні творца ўяўляў яго як працэс навучання чытаць пэўныя тэксты. Але, на думку Я. Коласа, «усвоіць самы працэс чытання яшчэ не значыць навучыць дзяцей чытаць у шырокім значэнні» [10]. У шырокім значэнні мэта навучання чытанню заключаецца ў тым, каб развіць у дзецях навыкі свядомага самастойнага чытання. Пісьменнік увёў таксама тэрмін «надворнае і ўнутранае якасці чытання». Пад надворнымі якасцямі чытання творца разумеў яго бегласць і правільнасць. Бегласць чытання заключаецца ў хуткім схватванні вачыма літарнага складу слова і пераводу яго на гукі. Пад правільнасцю разумеецца чыстае вымаўленне гукаў у складзе слова, у пэўным парадку без усякіх пропускаў, перастановак і замен аднаго гука другім. Да надворных якасцей чытання Я. Колас адносіў таксама і яго выразнасць. «Выразнасць чытання, - пісаў ён, - адзін са сродкаў для зразумення чытанага і для лагічнай работы над тэкстам» [11]. Пісьменнік лічыў, што выразна прачытаны твор і разумеецца лепш, і мацней адбіваецца ў памяці, робіць большае эстэтычнае ўражанне.

Унутранай якасцю чытання, на думку Я. Коласа, з'яўляецца яго свядомасць. Свядомае чытанне творца разумеў як уменне хутка схватваць у час чытання і асобныя думкі, і сам ход думкі, і яе значэнне. Свядомаму чьттанню Я. Колас проціпастаўляў механічнае чытанне, «калі вучань правільна вымаўляе словы, але не злучае з імі значэнняў, не разумее таго, што чытае» [12]. Пісьменнік арыентаваў беларускіх педагогаў на дзейнасць па навучанні школьнікаў свядомаму чытанню, якое фарміруецца «спосабам мнагалікіх і доўгіх практыкаванняў пры дапамозе настаўніка і пад яго кіраўніцтвам» [13].

Асобнае месца ў «Методыцы роднай мовы» займае раздзел, дзе разглядаюцца сродкі фарміравання свядомага чытання. Кампаратыўны аналіз дыдактычных метадаў навучання чытанню, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

існавалі ў педагагічнай практыцы, дазволіў Я. Коласу арыентавацца на «аб'ясняльнае чытанне», пад якім творца разумеў дыдактычныя метады, якія садзейнічаюць разуменню таго, што чытаецца. Перавагу гэтаму метаду творца аддаваў таму, што ён «дае вучням магчымасць набыць адзін з навыкаў чытання, навык чытаць свядома» [14]. Пісьменнік тлумачыў педагогам, што «аб'ясняльнае чытанне» адыгрывае вядучую ролю на першапачатковым этапе навучання, пакуль дзеці не навучацца чытаць талкова, але пасля гэтага яно паступова павінна скарачацца і спалучацца з іншымі метадамі і формамі. Я. Колас у гэтым раздзеле прапаноўвае настаўнікам і шэраг відаў заняткаў на ўроках «аб'ясняльнага чытання». Ён засяроджваў увагу педагогаў на актыўным удзеле саміх вучняў у чытанні. Выразнае чытанне настаўніка не павінна замяняць чытанне дзецьмі. У ім, па меркаванні пісьменніка, абавязаны прымаць удзел дзеці ўсяго класа, чытаючы па чарзе. Чытаць тэкст творца прапанаваў як па частках, так і ўвесь цалкам. Вельмі важна, каб настаўнік у працэсе чытання не пакінуў без увагі незразумелыя дзецям словы або часткі тэксту. У той жа час аўтар дыдактычнай працы папярэджваў педагогаў, што тлумачэнне не павінна засланяць само чытанне: «Усякае аб'ясненне павінна быць кароткім, немнагаслоўным» [15].

Якуб Колас быў перакананы, што эфектыўнасць працэсу навучання чытанню ў многім «залежыць не толькі ад спосабаў чытання, але і ад самога матэрыялу» [16]. У сваёй працы пісьменнік вызначыў важнейшыя патрабаванні да тэкстаў, прапанаваных дзецям для чытання. Па-першае, твор павінен быць цікавым для дзяцей і выклікаць у іх ахвоту да чытання. Па-другое, чытанка мусіць утрымліваць пэўныя і дакладныя веды. Па-трэцяе, тэкст, які даецца для чытання, «павінен закранаць у дзяцей лепшыя струны іх, развіваць успагаднасць, гатоўнасць стаяць за грамадзянскія ідэалы. Ён павінен выхоўваць спачуванне, маральную чуласць» [17]. Якуб Колас не раіў педагогам прапаноўваць у якасці чытання вершаваную і навукова-папулярную літаратуру. Творы для школьнага чытання, на яго думку, павінны быць напісаны спецыяльна. Праблему стварэння кніг для школьнікаў пісьменнік неаднаразова ўздымаў у сваіх публіцыстычных артыкулах. Так, у артыкуле «Быть гражданином» Я. Колас, аналізуючы школьную літаратуру, адзначаў, што ў адлюстраванні гісторыі беларускай культуры маецца шэраг недахопаў, адсутнічаюць добрыя падручнікі. Ён падкрэсліваў: «Хорошая хрестоматия, в которой умело подобраны наиболее характерные произведения, правильно отражающие развитие белорусской культуры и литературы, - фактор первостепенного значения в воспитании молодого поколения» [18]. Гэтае ж пытанне абвострана ставіў пісьменнік і ў «Прамове на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі» [19]. Менавіта з улікам стымулявання эмацыянальнай і крэатыўнай дзейнасці вучняў пабудавана яго «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», якое з'явілася ў друку ў 1910 г. [20].

Кампаратыўны аналіз тэкстаў прац К.Д. Ушынскага «Роднае слова» [21], «Дзіцячы свет» [22] і Цёткі (Э. Пашкевіч) «Першае чытанне для дзяцей беларусаў» [23] з коласаўскім «Другім чытаннем...» паказвае, што Я. Колас у многім быў іх пераемнікам і прадаўжальнікам. Яго ядналі з К.Д. Ушынскім і Цёткай блізкія погляды на ролю роднай мовы, вуснай народнай творчасці, прыроды ў фарміраванні светапогляду асобы. Кнігі Я. Коласа і Цёткі абапіраюцца на народную традыцыю, фальклор, вопыт народнай педагогікі. У той жа час аналіз названых прац дае падставы сцвярджаць, што «Другое чытанне...» больш дасканалае ў параўнанні з працай Цёткі. Абапіраючыся на вопыт пісьменніцы, Я. Коласу як вопытнаму настаўніку ўдалося пазбегнуць асобных хібаў, якія меліся ў яго папярэдніцы. Беларуская даследчыца ў галіне педагогікі С.В. Снапкоўская адзначае, што коласаўскае «Другое чытанне...» «...больш адпавядае дзіцячаму ўзросту, больш шырока адлюстроўвала падзеі і з'явы жыцця...» [24]. Яно мае свае адметнасці ў тэматыцы, асаблівасцях стылю і мовы. Творы, уключаныя пісьменнікам у чытанку, па жанры даволі разнастайныя: апавяданні, замалёўкі, нарысы, казкі, вершы, байкі. У кожным з іх выяўляецца эстэтычнае бачанне прыроды, пейзажу. Якуб Колас адухаўляе кожную прыродную з'яву, раскрывае чытачу прыгажосць усяго існага, імкнецца перадаць дзецям сваё пачуццё радаснага светаўспрымання. Нам падаецца, што праблемы прыроды, побыту, маралі ў творы, які аналізуецца, распрацаваны пісьменнікам з культуралагічнай заглыбленасцю, на даволі высокім тэарэтычным і дыдактычным узроўнях. Лексічную аснову пейзажных замалёвак у «Другім чытанні...» ствараюць словы, якія абазначаюць прыродныя рэаліі. Разам з тым пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адсутнасці асаблівай экспрэсіі яны вызначаюцца багаццем фарбаў і адценняў, тэматычнай разнастайнасцю. Кожнае слова-дыскурс у аўтарскім кантэксце раскрывае дзецям свае нябачныя, стоеныя сілы дзякуючы ўмеламу выкарыстанню, спалучальнасці і ўзаемасувязям з іншымі словамі.

Яшчэ адну вельмі важную, на наш погляд, думку сфармуляваў Я. Колас на старонках працы, якая аналізуецца. Па яго меркаванні чытанне павінна спалучацца з навучаннем роднай мове. Такую ж думку, дарэчы, абгрунтаваў прадстаўнік французскага постструктуралізму Р. Барт, які лічыў, што тэкст патрабуе, каб мы імкнуліся да скарачэння дыстанцыі паміж пісьмом і чытаннем, не акцэнтавалі ўвагу чытача на твор, а аб'ядноўвалі чытанне і пісьмо ў адзінай знакавай дзейнасці [25]. Аналіз тэкстаў коласаўскіх твораў дае падставы для высновы, што пісьменнік выключную ролю ў фарміраванні этнічнага светаадчування асобы надаваў беларускай мове як ядру культуры. У артыкулах «З поваду майго юбілею» [26], «Литературная учеба» [27], «Мова М. Лынькова па раману "На чырвоных лядах"» [28], «Шануйце і любіце сваю родную мову» [29], «Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову» [30] і іншых публіцыстычных творах Я. Колас сцвярджае, што мова - гэта асноўны вынік і сродак культуры, матэрыялізаванае думанне, выяўленне ступені развіцця нацыі. На думку пісьменніка, мова выступае ў якасці фактару найлепшага развіцця асобы, важнейшай умовы яе гарманічнага існавання. «Роднае слова, - адзначаў Я. Колас, звяртаючыся да беларускіх школьнікаў, - гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет. Пагэтаму вам неабходна так старанна вывучаць сваю родную мову, ведаць і любіць лепшыя творы беларускай літаратуры» [31]. Лейтматывам у коласаўскай творчай спадчыне праходзіць думка аб тым, што без роднай мовы адбываецца дэградацыя асобы і грамадства, занядбанне іх інтэлектуальнага, творчага, маральнага патэнцыялу.

Спасціжэнне асобай мовы, дарэчы як і ўвесь працэс яе інкультурацыі, на думку Я. Коласа, павінны быць у цэнтры ўвагі нацыянальнай школы, якая пачала фарміравацца ў пачатку XX ст. Філасофска-педагагічны погляд на месца і ролю школы, змест, формы і метады яе дзейнасці акрэсліў творца ў трылогіі «На ростанях», шэрагу публіцыстычных твораў. Дастаткова сказаць, што праблемы беларусізацыі школы разглядаюцца ім у артыкулах «Слуцкія курсы» [32], «Школа і дарожнае будаўніцтва» [33], «Нашы савецкія дзеці» [34], «Задачы савецкай школы» [35] і іншых творах. Ён выказваўся за пашырэнне сферы ўжытку беларускай мовы. наданне ёй не толькі дзяржаўнага, але мажарытарнага статуса. Пісьменнік разглядае мову не толькі як адзін са школьных прадметаў, але і як важнейшы сродак сацыялізацыі, які мае «агульна-асветнае», «выхавальнае» і «практычнае значэнне» [36]. Тут жа творца паказвае месца роднай мовы ў працэсах мыслення школьнікаў, разумення і ўяўлення імі з'яў культуры. Удзел мовы ў дзейнасці мыслення заключаецца ў тым, «што яна дае разуменням і ўяўленням, з якімі мае дачыненне мысленне, слоўныя значэнні. Без падтрымання словам наша мысленне было б перарваным і нячоткім» [37]. У сувязі з гэтым першачарговай задачай у справе беларусізацыі школы, пераконваў пісьменнік, з'яўляецца навучанне роднай мове. Акрамя навукова-тэарэтычнага абгрунтавання ролі мовы ў інкультурацыі асобы Я. Колас робіць шэраг практычных крокаў па выяўленні ўмоў, спосабаў, метадаў і форм навучання беларускай мове. У «Методыцы роднай мовы» ён паказвае, «як трэба весці навучанне роднай мове, каб яно было паспешным і навукова правільным» [38]. Прааналізаваўшы ў гістарычным ракурсе мноства метадаў навучання мове, якія існуюць у шэрагу еўрапейскіх краін, творца прыходзіць да высновы, што «лепшым метадам трэба прызнаць такі метад, каторы не гвалтуе дзіцячай прыроды і ідзе на спатканне яе патрэбам» [39]. Якуб Колас прапаноўвае настаўнікам выкарыстоўваць пры навучанні дзяцей грамаце комплекс метадаў: вобразна-маторны, гукавы, цэлых вобразаў і інш.

Такім чынам, на падставе тэксталагічнага аналізу твораў Я. Коласа можна прыйсці да высновы, што пісьменнік заклаў асновы айчыннай культуры чытання як важнейшай умовы фарміравання ў асобы такіх якасцей, як любоў да Радзімы, гуманнасць, праўдзівасць, цвёрдая воля і характар, эстэтычных пачуццяў. Коласаўская парадыгма чытання ў многім захоўвае сваю жыццёвасць для школы, сям'і і бібліятэк у нашым інфармацыйным грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛІТАРАТУРА


1. **Бахтин, М. М.** Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. Москва : Художественная литература, 1975. С. 329.
2. **Кристева, Ю.** Разрушение поэтики / Ю. Кристева // М. М. Бахтин: pro et contra : творчество и наследие М. М. Бахтина в контексте мировой литературы. Санкт-Петербург, 2002. Т. 2. С. 13.
3. **Лукашенко,** А. **Г.** Выступление президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на церемонии возложения венков к монументу победы / А. Г. Лукашенко // Информационный бюллетень Администрации Президента Республики Беларусь. 2010. №8 (171). С. 2.
4. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы, 1947-1956 гг. Методыка роднай мовы / *Я.* Колас. Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. С. 313-505.
5. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы, 1917-1946 гг. / Я. Колас. Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. С. 396.
6. **Библиотечный** Давос - 2009 // Библиотечное дело. 2009. № 7. С. И.
7. **Бородина, В.** А. Психология чтения / В. А. Бородина. Санкт-Петербург : Санкт-Петербургская государственная академия культуры, 1997. С. 3.
8. **Колас, Я.** Збор гвораў : у 14 т. Т. 12 ... С. 396.
9. Тамжа. С. 402.
10. Там жа. С. 396.
11. Там жа. С. 398.
12. Там жа.
13. Там жа. С. 396.
14. Там жа. С. 401.
15. Там жа. С. 407.
16. Там жа. С. 402.
17. Там жа. С. 403.
18. Там жа. С. 28.
19. Там жа. С. 231-235.
20. **Колас, Я.** Другое чытанне для дзяцей беларусаў / Я. Колас. Пецярбург : Загляне сонца **і** ў наша ваконца ; Наша хата, 1909. 112 с.
21. **Ушинский, К. Д.** Родное слово : книга для детей и родителей / К. Д. Ушинский ; составитель Н. Г. Ермолина. Новосибирск : Магнезия, Детская литература, 1999. 448 с.
22. **Ушинский, К. Д.** Детский мир : для детей, родителей и педагогов : в 2 ч. / К. Д. Ушинский. Москва : Лествица, 2000.
23. **Ciotka.** Pierszaje czytanne dla dziatak bielarusou / Ciotka. Pieciarburh : Drukarnia Piantkouskaha, 1906. 32 c.
24. **Снапкоўская, С. В.** Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі : з гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX - пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. Мінск : Народная асвета, 1995. С. 52.
25. **Барт, Р.** Избранные работы : Семиотика. Поэтика : перевод с французского / Р. Барт ; составление, общая редакция и вступительная статья Г. К. Косикова. Москва : Прогресс, Универс, 1994. С. 420.
26. **Колас, Я.** Збор твораў : у 14 т. Т. 11 ... С. 87-90.
27. Там жа. С. 114-116.
28. Там жа. С. 154-157.
29. **Колас, Я.** Збор твораў : у 14 т. Т. 12 ... С. 25-26.
30. Там жа. С. 132-136.
31. Там жа. С. 26.
32. **Колас, Я.** Збор твораў : у 14 т. Т. 11 ... С. 29-31.
33. Там жа. С. 61-63.
34. Там жа. С. 218-220.
35. **Колас, Я.** Збор твораў : у 14 т. Т. 12 ... С. 39-42.
36. Тамжа. С. 318.
37. Там жа.
38. Там жа. С. 317.
39. Там жа. С. 348.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ